# Таварышу СТАЛІНУ І. В.

## Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

З першых дзён вялікай айчыннай вайны беларускі народ па Вашаму, таварыш Сталін, закліку ўзняўся на свяшчэнную барацьбу супроць ненавісных нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Сотні тысяч беларускіх партызан і партызанак днём і ноччу знішчаюць нямецкіх захопнікаў, знішчаюць тэхніку, разбураюць тылы варожых войск.

На ўсёй тэрыторыі нашай роднай Беларусі — ад Нёмана да Дняпра, ад Беластока і Брэста да Віцебска, Магілёва і Гомеля—ідзе нязгасная народная вайна супроць нямецкіх прыгнятальнікаў.

Сотні тысяч воінаў-беларусаў на фронце ў радах доблеснай Чырвонай Арміі гераічна змагаюцца за свабоду нашага народа, за поўнае выгнанне чужаземных захопнікаў з прэдзелаў нашай радзімы.

Беларускія рабочыя, калгаснікі, служачыя і інтэлігенцыя, эвакуіраваныя са сваімі заводамі, фабрыкамі, соўгасамі, МТС у тыл Савецкага Саюза, куюць смертаносную зброю для знішчэння нямецкіх захопнікаў, аказваюць усямерную дапамогу слаўнай Чырвонай Арміі ў хутчэйшым разгроме ворага.

Натхнёны перамогамі Чырвонай Арміі, беларускі народ—рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя, партызаны і партызанкі—актыўна ўдзельнічае ў патрыятычным руху ў нашай краіне па збору сродак у фонд абароны радзімы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі

Сакратар Цэнтральнага Камітэта
КП(б) Беларусі ПАНАМАРЭНКА.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага
Совета Беларускай ССР НАТАЛЕВІЧ.

Старшыня Совета Народных
Камісараў Беларускай ССР БЫЛІНСКІ.